З першых вуснаў

# «Нацыя можа развівацца толькі на пазітыўных ідэях і справах»

## Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды і пагоны вышэйшаму афіцэрскаму і кіруючаму складу

**Па традыцыі, якая склалася за некалькі гадоў, напярэдадні галоўнага жаночага свята Палац Незалежнасці прымае шаноўных гасцей з ліку жанчын, узнагароджаных ордэнам Маці і мужчын, якім прысвоена чарговае воінскае званне. Акрамя дзясятка маці і шасці прадстаўнікоў сілавых структур, з рук Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі атрымалі ўзнагароды дзяржаўныя служачыя, работнікі вытворчасці і сельскай гаспадаркі, настаўнікі, медыкі — адным словам, тыя, хто дасягнуў значных поспехаў у прафесійнай дзейнасці.**


Фота БелТА.

Галоўны ўрач Віцебскага абласнога клінічнага раддома Алена ЛЕАНОВІЧ узнагароджана ордэнам Пашаны.

Прэзідэнт у сваім выступленні адзначыў, што ў Год народнага адзінства традыцыйная цырымонія мае асаблівы сэнс: тут сабраліся людзі, якіх можна лічыць перадавым атрадам арміі дабра і стварэння, творчымі асобамі, нацэленымі на вынік.

«І гэта вельмі важна. Бо нацыя, якая клапоціцца аб заўтрашнім дні, можа згуртавацца і паспяхова развівацца толькі на пазітыўных ідэях і справах. Кожны з вас працуе на Айчыну і народ, сваёй працай робіць нашу краіну мацнейшай і прыгажэйшай. Гэта армія, адданая народу і прысязе, органы правапарадку, якія верныя свайму абавязку. І гэта яны спраўна прадэманстравалі ў апошнія месяцы», — адзначыў кіраўнік краіны.

Ён мяркуе, што за гады незалежнасці ў нас сфарміравалася грамадства, якое добра ўсведамляе, што падмурак адзінства народа і яго паспяховай будучыні — упартая стваральная праца, згуртаванасць і ўзаемадапамога. «Па-іншаму і быць не павінна, бо мы жывём на роднай зямлі, мы адзіны народ, любім сваю краіну і зробім усё, каб дзеці і ўнукі жылі ў міры і згодзе. Сёння па традыцыі мы ўручаем генеральскія пагоны сапраўдным мужчынам, якія прывыклі прама глядзець у вочы небяспецы і добра ведаюць цану міру і чалавечага жыцця», — заявіў Прэзідэнт.

Таксама ён выказаў словы ўдзячнасці ўсім тым, хто зараз знаходзіцца на варце, ахоўвае мірную працу і спакой беларусаў. Асаблівыя словы падзякі ад Аляксандра Лукашэнкі — супрацоўнікам міліцыі, якія адзначалі ўчора сваё прафесійнае свята.

«Лёсам вызначана, што прызначэнне мужчыны — абараняць. У той час як прызначэнне жанчыны — быць захавальніцай ачага, сямейных і нацыянальных традыцый, каштоўнасцяў», — дадаў кіраўнік краіны.

Гаворачы аб ролі жанчын, Прэзідэнт адзначыў: «Гэта вы ў літаральным сэнсе слова дорыце жыццё, дапамагаеце маленькаму чалавеку зрабіць першыя крокі, адкрываеце для яго вялікі свет. Вы ўсё паспяваеце: клапоціцеся пра родных і блізкіх, ствараеце атмасферу цяпла і ўтульнасці ў доме, пастаянна вучыцеся, дасягаеце вялікіх прафесійных поспехаў, актыўна ўдзельнічаеце ў грамадскіх справах і палітыцы. Часта пераўзыходзіце нас, мужчын», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, мы ўсе разам пабудавалі і адстаялі незалежную Беларусь. «І ў гэтым ваша вялікая заслуга. Наша заслуга таксама немалая. Мы гэта ўсё рабілі дзеля вас. Не было б вас, не было б тых спраў, якія ўласцівы сапраўдным мужчынам. Упэўнены, у поўнай меры гэта адносіцца да ўсіх жанчын, якім я сёння з велізарным задавальненнем уручу дзяржаўныя ўзнагароды», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Асаблівыя словы ўдзячнасці і захаплення Аляксандр Лукашэнка адрасаваў шматдзетным маці. «Вы выконваеце сваю галоўную і важную місію на зямлі, — канстатаваў ён. — І не трэба казаць, што жанчыны — гэта слабы пол. Вы моцныя і мацнейшыя за нас. Вы не проста адказна і добрасумленна ставіцеся да справы, але і нам, мужчынам, даяце матывацыю да працы, натхненне для творчасці, становіцеся апорай у цяжкіх сітуацыях, часам немагчымых».

Напярэдадні веснавога свята самыя цёплыя віншаванні адрасаваў кіраўнік краіны ўсім жанчынам — маці, сёстрам, жонкам, дочкам, сяброўкам і калегам.

«Беларускія жанчыны — гэта не проста наша багацце, гэта здабытак нацыі. Дазвольце мне павіншаваць усіх вас з узнагародамі і высокімі званнямі. Абсалютна ўпэўнены, што гэта добрая традыцыя захаваецца назаўсёды», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу, што ўсе ўзнагароды і званні маюць асаблівую вагу ў сённяшняй сітуацыі. Генералаў, якія атрымалі пагоны, кіраўнік краіны назваў людзьмі, якім можна давяраць і якія здольныя абараніць нашу краіну.

«І вы, жанчыны, нараджаючы для нас дзяцей, павінны быць абсалютна ўпэўненыя, што вы і вашы дзеці знаходзіцеся пад нашай жалезнай аховай. Вы за гэта не турбуйцеся і не хвалюйцеся. Мы сапраўды вас нікому не аддадзім», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### • Каментарый у тэму

**Жанна БАТУРЫЦКАЯ, начальнік упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС** (атрымала званне «Заслужаны супрацоўнік органаў МУС»): «Па спецыяльнасці я заўсёды займалася работай, звязанай з выкананнем прыгавораў. Акрамя таго, заўсёды ўдзельнічала ў заканатворчай дзейнасці. Трэба сказаць, што я брала ўдзел у распрацоўцы ўсіх законаў аб амністыі, якія рыхтаваліся ў нас з 1996 года. То-бок гэта 16 праектаў і законаў, якія потым былі прыняты кіраўніком дзяржавы. Я арганізоўвала здзяйсненне законаў аб амністыі ў нашых установах выканання пакарання.

Кожная работа, і мая таксама, патрабуе аддаваць сябе, калі ты хочаш стаць прафесіяналам. Ты жывеш работай, пастаянна вучышся, вывучаеш чыйсьці вопыт, чытаеш шмат літаратуры, маеш зносіны з калегамі. Ты заўсёды ў руху. Нельга адбыцца ў прафесіі, знаходзячыся на адной пляцоўцы, трэба ўдасканальвацца.

Я ганаруся тым, што магу спалучаць жаноцкасць, сям'ю і службу. Я атрымліваю задавальненне і ад аднаго, і ад другога».

**Вольга НЯФЁДАВА, актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы** (атрымала медаль Францыска Скарыны): «Для ўсіх было дзіўна, што мы ўсёткі адкрылі 101-ы сезон 3 сакавіка пасля сямі месяцаў, калі павінна было адбыцца адкрыццё. Як учора прымаў нас глядач — нешта неверагоднае! Мы жартавалі, што, мабыць, так «Паўлінку» прымалі толькі ў 1944 годзе. Людзі не адпускалі, крычалі «Дзякуй». Мы ўсе былі кранутыя да слёз, бо была зроблена вялікая работа. Нас засталося мала, каб выпусціць спектакль. Я думаю, усё наперадзе... Для маладых рабят гэта было баявое хрышчэнне. Яны казалі, што такога не чакалі, дзякавалі за магчымасць выходзіць на гэтую сцэну».

**Мікалай КАРПЯНКОЎ, намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі** (яму прысвоена званне генерал-маёра): «Адчуваю хваляванне і гордасць. Гордасць за калектыў, якім кірую. Унутраныя войскі — асноўная сіла і магутнасць Міністэрства ўнутраных спраў. Там служаць самыя адданыя і надзейныя абаронцы нашай Айчыны. Перадусім маё званне — заслуга калектыву, якім я кірую. Ён гатовы з поспехам выканаць усе адказныя задачы, якія перад намі паўсталі. Мы, камандзіры, выконвалі складаныя задачы, не баяліся рызыкаваць, хацелі наступаць, перамагаць, хацелі хуткага навядзення парадку. Мы адчувалі, што кіраўнік краіны ўсё трымае пад кантролем, валодае абстаноўкай. Мы бачылі разумныя рашэнні і атрымлівалі дакладныя загады, а ў самыя складаныя моманты кіраўнік дзяржавы разам з намі знаходзіўся ў баявым парадку, дэманструючы сабою мужнасць і прыклад таго, як трэба любіць і абараняць сваю Радзіму. Такім чынам, аб'яднаўшыся, мы прыйшлі да перамогі.

Хачу сказаць, што наш абавязак перад сённяшнім і будучым пакаленнямі — захаваць краіну, і мы яе захаваем, чаго б гэта ні каштавала. Усведамляем свой абавязак па ахове бяспекі нашай Радзімы, захаванні нацыянальнага суверэнітэту. Мы гатовыя да выканання задач любой складанасці».

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Эксперты Bloomberg назвалі галоўны драйвер аднаўлення сусветнай эканомікі



Згодна з данымі агенцтва, за час пандэміі каранавіруса спажыўцы ў найбуйнейшых эканоміках планеты назапасілі каля 2,9 трыльёна долараў. Толькі ў грамадзян ЗША такіх назапашванняў $1,5 трлн, што перавышае сярэднегадавы рост ВУП краіны, а таксама з'яўляецца эквівалентам гадавога аб'ёму вытворчасці Паўднёвай Карэі. Эксперты адзначаюць, што гэта вялікія грошы. І менавіта яны стануць асноўным драйверам для вяртання глабальнай эканомікі да дакавідных паказчыкаў. На думку спецыялістаў, апытаных агенцтвам, гэтыя грошы будуць выдаткаваны на шопінг, рэстараны, турызм, забавы і спорт. Шэраг экспертаў лічыць, што людзі накіруюць назапашаныя сродкі на пакрыццё даўгоў.

### Volvo поўнасцю пяройдзе на вытворчасць электрамабіляў



Шведскі аўтаканцэрн Volvo Cars мае намер да 2030 года поўнасцю перайсці на вытворчасць электрамабіляў. Аб гэтым паведаміла Financial Times са спасылкай на заяву кампаніі. «Кліент заўсёды мае рацыю, але я абсалютна перакананы, што [да канца дзесяцігоддзя] не застанецца кліентаў, якія сапраўды хацелі б машыну з бензінавым рухавіком», — заявіў гендырэктар канцэрна Хакан Самуэльсан. Кампанія таксама плануе прадаваць усе свае машыны анлайн, самастойна кантраляваць цэнаўтварэнне і адмовіцца ад супрацоўніцтва з аўтадылерамі. «Мы хочам мець трывалыя адносіны з кліентамі, якія непасрэдна выкарыстоўваюць нашы аўтамабілі», — адзначыў Самуэльсан. Volvo не першы з сусветных аўтавытворцаў заявіў пра намер перайсці на выпуск выключна электрамабіляў. Раней аб пераходзе на вытворчасць электракараў ужо да 2025 года паведаміў Jaguar Land Rover.

### У Аргентыне знайшлі астанкі найстаражытнейшага тытаназаўра



Палеантолагі знайшлі ў аргентынскай Патагоніі астанкі самага старажытнага тытаназаўра ў свеце, паведаміла CNN. Навукоўцы выявілі акамянелыя косткі буйной траваеднай жывёлы на поўдні горада Неукен. Адзначаецца, што старажытны яшчар дасягаў у даўжыню 20 метраў, узрост акамянеласцяў складае 140 мільёнаў гадоў. Дзякуючы знаходцы стала відавочна, што тытаназаўры існавалі нашмат раней, чым меркавалася да гэтага. «Рэшткі знаходзяць у розных канцах свету, але тыя, аб якіх было вядома раней, былі бліжэйшыя да сучаснасці, чым новая знаходка», — расказаў адзін з даследчыкаў.

Блізкая ўлада

# ВЯСНА ЗВАНКОЎ НЕ АДМЯНЯЕ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 6 сакавіка, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44